ЛИТЕРАТУРА
1. Бычек, И.И. Деловые интеллектуальные игры в контексте преподавания менеджмента и маркетинга / И.И. Бычек, Н.В. Никитина // Перспективы развития высшей школы: материалы X Международной научно-методической конференции. Учреждение образования «Гродненский государственный аграрный университет». 2017. - С. 106-108.
2. Бычек, И.И. Повышение конкурентоспособности управленческого персонала сельскохозяйственного предприятия / И.И. Бычек // Современные технологии сельскохозяйственного производства: сборник научных статей по материалам XX Международной научно-практической конференции. – Гродно: ГГАУ, 2017. – С. 25-27
3. Никитина, Н.В. Роль проективных психологических тестов в деятельности преподавателя / Н.В. Никитина, И.И. Бычек // Материалы X Международной научно-методической конференции. Учреждение образования «Гродненский государственный аграрный университет». 2017. - С. 398-400.
4. Эффективность взаимодействия образовательных учреждений и бизнес-среды: теория, методология, практика: колл. монография / Т. Н. Бондаренко [и др.]; под науч. ред. д-ра экон. наук, проф. А. П. Латкина. - Владивосток: Изд-во ВГУЭС, 2010.

УДК 378.663:37.091.321:655.535.54 (476.6)

# РЭФЕРАТ ЯК КАМПАНЕНТ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

**А.М. Асіпчук**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт” (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца асноўныя віды рэфератаў, якія прапануюцца студэнтам для самастойнай працы.
Ключавыя словы: рэферыраванне, інфарматыўны рэферат, індыкатыўны рэферат, рэферат-даклад.

# РЕФЕРАТ КАК КОМПОНЕНТ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ

**О.Н. Осипчук**
УО “Гродненский государственный аграрный университет” (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье рассматриваютсяосновные виды рефератов, которые предлагаются студентам для самостоятельной работы.
Ключевые слова: реферирование, информативный реферат, индикативный реферат, реферат-доклад.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

# ABSTRACT AS A COMPONENT OF STUDENTS' INDEPENDENT WORK

**A.M. Asipchuk**
EI "Grodno State Agrarian University" (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article considers the main types of abstracts that students are offered for independent work.
Key words: referencing, informative abstract, indicative abstract, abstract-report.

Важным аспектам пры падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў у ВНУ з'яўляецца самастойная праца студэнтаў (далей СПС). Прынцып "навучыць вучыцца" выходзіць сёння на першы план. Сярод задач, якія прадугледжвае дысцыпліна "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" падчас арганізацыі СПС, называюцца і такія, як "… падрыхтоўка вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, … рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш." [1, с. 9]. Спынімся больш падрабязна на рэфераце як адным з элементаў СПС.

Студэнты, безумоўна, маюць агульнае ўяўленне аб рэферацеса школьнага курса, у іх ёсць пэўны вопыт напісання рэфератаў пераважна па гуманітарных і прыродазнаўчых прадметах. Захоўваючы пераемнасць у адукацыйным працэсе і ўлічваючыраней набытыя веды, выкладчыку вышэйшай школы неабходна паказаць ролю рэферыравання пры падрыхтоўцы дакладаў, курсавых і дыпломных прац; развіць навыкі рэфератыўнага чытання і перапрацоўкі тэкстаў.

Пры вывучэнні тэмы "Жанры навуковай літаратуры" засяроджваецца ўвага на класіфікацыі рэфератаў у залежнасці ад паўнаты выкладу інфармацыі (*інфарматыўныя* і *індыкатыўныя*), колькасці першакрыніц (*манаграфічныя* і *аглядныя*), чытацкага прызначэння (*агульныя* і *спецыялізаваныя*). Сам рэферат з'яўляецца вынікам кампрэсіі (сціскання) зместу першакрыніцы.Студэнты знаёмяцца з двума шляхамі кампрэсіі тэксту:1)змяншэнне інфармацыі; 2) захаванне інфармацыі ў адносна поўным аб'ёме пры дапамозе прыёмаў *апушчэння*, *сумяшчэння* і *замяшчэння*. Як заўважае В.В. Маршэўская, "рэферат павінен быць аб'ектыўным, поўным, лагічным, адпавядаць стылістычным нормам" [2, с. 165].

Перш чым прапаноўваць рэферыраванне навуковых тэкстаў у якасці СПС патрэбна на практычных занятках адпрацаваць усе названыя шляхі кампрэсіі інфармацыі на адносна невялікіх фрагментах

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

тэкстаў па спецыяльнасці або тэкстах навукова-папулярнай літаратуры. Варта звярнуць увагу студэнтаў і на такія тыповыя памылкі пры рэферыраванні, як "неапраўданая страта навуковай інфармацыі, скажэнне сэнсу першакрыніцы, адсутнасць логікі ў падачы інфармацыі" [2, с. 158]. Акрамя таго, выкладчык павінен патлумачыць, што такое *рэфератыўны від чытання*, які прадугледжвае выдзяленне найбольш інфарматыўных элементаў першакрыніцы, сэнсавы падзел выказвання на тэму і рэму.

*Інфарматыўныя* рэфераты (рэфераты-канспекты) складаюцца з уступу, у якім змяшчаецца бібліяграфічнае апісанне, асноўнай часткі і заключэння. Пры змяншэнні тэксту важна не страціць галоўную думку аўтара, найбольш істотныя палажэнні і вывадыяго працы. Выклад інфармацыі тут адбываецца выключна з пазіцыі аўтара першакрыніцы і не можа насіць суб'ектыўны (г. зн. з пункту гледжання рэферэнта) характар. У заключнай частцы рэферата-канспекта мэтазгодна падкрэсліць значэнне і актуальнасцьгэтай навуковай працы.

У *індыкатыўных* рэфератах (рэфератах-рэзюмэ) называюць толькі асноўную тэму першакрыніцы (менавіта *аб чым* дадзеная кніга, артыкул, манаграфія і пад.), указваюць ключавыя словы, назвы параграфаў, раздзелаў, колькасць ілюстрацый, табліц; падаюць дакладныя бібліяграфічныя звесткі. Такія рэфераты яшчэ называюць "рэфератыўнай анатацыяй", якая дапамагае пры падборы навуковай літаратуры.

Асабліва пашыранымі з'яўляюцца *рэфераты-даклады*, што рыхтуюцца студэнтамі для выступлення на практычных занятках. Тэмы паведамленняў не абмяжоўваюцца толькі прафесійнай накіраванасцю і маюць самы разнастайны спектр: гістарычныя, псіхалагічныя, літаратурныя, культуралагічныя, прыродазнаўчыя і інш. Студэнты выбіраюць найбольш цікавыя, на іх думку, тэмы і абавязкова (у адрозненне ад інфарматыўнага рэферата) выказваюць сваё меркаванне, часам крытычнае бачанне той ці іншай праблемы. Як правіла, рэферат-даклад пішацца на аснове некалькіх крыніц, таму папярэдне неабходна заканспектаваць іх, прадумаць план выступлення. Пажадана наяўнасць цытат, якімі падмацоўваецца паведамленне. Кампазіцыйна рэферат-даклад складаецца з уводзін, асноўнай часткі і заключэння. Пры складанні рэфератаў студэнты таксама вучацца афармляць спасылкі ў адпаведнасці з ДАСТам.

Такім чынам, рэферат як кампанент СПС садзейнічае развіццю навыкаў працы з навуковай літаратурай, уменню якасна перапрацоўваць неабходную інфармацыю.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

ЛІТАРАТУРА
1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў / склад.: М.Р. Прыгодзіч, Г.І. Кулеш, Н.П. Лобань; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча. – Мінск: РІВШ, 2008. – 28 с.
2. Маршэўская, В.В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: Вучэб. дапам. / В.В. Маршэўская. – Гродна: ГрДУ, 2003. – 274 с.

УДК 378.4

# ФОРМИРОВАНИЕ КОНФЛИКТОЛОГИЧЕСКОЙ КОМПЕТЕНТНОСТИ БУДУЩИХ УЧИТЕЛЕЙ

**Н.А. Пронина**
ФГБОУ ВО «Тульский государственный педагогический университет им. Л.Н. Толстого» (Россия, 300026, город Тула, Пр. Ленина, 125; e-mail: natalie4941@rambler.ru)

Аннотация. На основе опыта преподавания в педагогическом университете раскрываются особенности формирования конфликтологической компетентности будущих учителей. Приводятся результаты исследования, доказывающие, что повысился уровень подготовки выпускников к профессиональной деятельности.
Ключевые слова: будущий учитель, формирование, конфликт, компетентность

# THE FORMATION OF CONFLICT COMPETENCE OF FUTURE TEACHERS

**N. A. Pronina**
Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education «Tula State Lev Tolstoy Pedagogical University» (Russia, 300026 Tula, 125 Lenin st.; e-mail: natalie4941@rambler.ru)

Summary. On the basis of experience of teaching in the pedagogical university features of formation of konfliktologichesky competence of future teachers are revealed. The results of a research proving that the level of training of graduates to professional activity has increased are given.
Keywords: future teacher, formation, conflict, competence

Современному обществу необходимы учителя, владеющие искусством слова, способные разрешать любые конфликтные ситуации, которых в повседневной жизни школы огромное количество.

Для этого необходимо сформировать конфликтологическую компетентность будущего педагога.